# Роля рэлігійнай дамінанты ў выхаванні патрыёта і грамадзяніна (на прыкладзе педагагічнай думкі Беларусі XIV–XV стст.)

**Шчэрбін Марына Міхайлаўна,**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна
(г. Мазыр, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны выяўленню ролі рэлігійнай састаўляючай зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XV стст. На падставе аналізу гістарычных крыніц вызначаны хрысціянскі падмурак шэрагу*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*грамадзянска-патрыятычных якасцей даследуемага перыяду, паказана яго значнасць у працэсе сацыялізацыі асобы ва ўмовах сярэдневяковай рэчаіснасці.*

Рэлігія для перыяду Сярэднявечча выступала вызначальным паказчыкам грамадскага, культурнага і духоўнага жыцця, што меў "цывілізуючы ўплыў на жыццё чалавецтва" [1, с. 33]. Распаўсюджванне хрысціянскай філасофіі насіла не толькі важнае "агульнасветапогляднае, але і педагагічнае значэнне", абумоўленае "першаснасцю духоўнага ў адносінах да матэрыяльнага, высокімі маральнымі імператывамі, служэннем дабру і праўдзе" [2, с. 76].

Адной з запатрабаваных якасцей у змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання XIV–XV стст. з'улялася **дабрачыннасць і ўзаемадапамога** ў адносінах да іншых. *"Уважительный и добрый будь ко всякому человеку, и за глаза и в глаза"* – гэта спосаб *"достичь многого в глазах Бога и людей"*, – сцвярджалі старажытныя крыніцы, настаўляючы маладое пакаленне [5, с. 497]. Неабходнасць суаднясення сваіх учынкаў з зацверджанымі нормамі супольнай жыццядзейнасці мела значнае выхаваўчае ўздзеянне на асобу, была сугучна ідэям актыўнай дабрачыннасці. *"Не место делает добродетельным, но добродетели место украшают"*, – былі ўпэўнены нашы продкі [6, с. 486].

Разуменне дабрачыннасці абапіралася на ідэю "агульнага дабра", што трымала светапоглядную сістэму сярэдневяковага чалавека, заснаваную на хрысціянскім чалавекалюбстве. *"Вспомни голод во время сытости, бедность и убогость во время изобилия, с утра и до вечера переменится время"*, – падкрэслівалі флярэлегіі, высока ацэньваючы ўменне спачуваць і дапамагаць іншым як важную асобасную якасць [6, с. 477].

Важную ролю сярод грамадзянска-патрыятычных якасцей ў XIV–XV стст. адыгрывала **імкненне да пераемнасці і адзінства**. Вядомыя словы летапісца *"в единстве нашем великая сила"* сталі своеасаблівым заклікам да згуртаванасці і дзяржаўна-палітычнага яднання на беларускіх землях [4, с.98]. Развіццё грамадства з арыентацыяй на цэласнасць разглядалася гарантам існавання народу, закладам яго росквіту: *"згода будуе, а нязгода райнуе"*, – пераконвалі нашы продкі [4, с. 58].

Пры гэтым, калі падтрымка тэрытарыяльнага адзінства разумелася падмуркам развіцця дзяржаўна-палітычных працэсаў, то духоўная пераемнасць выступала ў XIV–XV стст. важным сродкам ідэнтыфікацыі асобы з пэўным гісторыка-культурным асяроддзем. Менавіта духоўна-светапогляднае яднанне забяспечвала хрысціянства, якое садзейнічала таму, што ўяўленні аб Радзіме "перарастаюць межы сялянскай абшчыны і нават княства, пашыраючыся да зямлі-краіны" [3, с. 179]. З рэлігійным аднадумствам атаясамлівалася на ўсходнеславянскіх землях грамадзянска-патрыятычная ідэя аб'яднання, абароны супраць знешняй пагрозы як найпершых акалічнасцей існавання народу. У якасці аднаго з самых цяжкіх выпрабаванняў для чалавека крыніцы, што апелявалі да хрысціянскай этыкі, адзначалі быць *"пришельцами в земле не своей"* [4, с. 45].

Значнай грамадзянска-патрыятычнай якасцю ў XIV–XV стст., з'улялася **субпарадкаванне асабістых інтарэсаў грамадскім**, што праяўвілася ў апеляцыі да хрысціянскага сумлення і традыцый супольнай жыццядзейнасці. У сувязі з тым, што "маральная свядомасць хрысціян з'яўлялася сацыяльна і гістарычна абумоўленай адлюстраваннем іх практычных паводзін у калектыве і грамадстве" [1, с. 58.].

А.П. Забіяка звяртаў увагу на тое, што "для культур, успрыняўшых хрысціянства, характэрным з'яўляецца тое, што асэнсаванне і ўвасабленне вы-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шэйшых каштоўнасцей і ідэалаў адбывалася пад уплывам уяўленняў аб Богу" [Заб. с. 167]. Яшчэ Уладзімір Манамах сцвярджаў у якасці *"начала всякого добра"* неабходнасць *"страх Божий в сердце иметь"* [4, с. 124]. Выкананне свайго маральнага абавязку з'яўлялася абавязковай умовай жыцця хрысціяніна, садзейнічала прывучэнню чалавека да справядлівага быцця сярод іншых людзей.

Заснаванае на моцным духоўна-рэлігійным падмурку супарадкаванне асабістых інтарэсаў грамадскім мела важнае значэнне з пункту гледжання захавання міру ва ўмовах феадальнага грамадства. Пры адсутнасці шырокараспаўсюджаных пісаных норм зварот да сумлення, маральнага абавязку асобы – дзейсны сродак выхавання асобы патрыёта і грамадзяніна.

Важнейшае месца сярод грамадзянска-патрыятычных якасцей займала **самаадданасць**, якая мела трывалую сувязь з духоўна-рэлігійнымі дамінантамі светаўспрымання беларусаў. Перапляценне абавязку рэлігійнага і грамадзянска-патрыятычнага праявілася ў асэнсаванні адказнасці за свае ўчынкі і справы як перад Богам, так і перад грамадствам. Хрысціянскія самаахвярнасць, адданасць, набожнасць, набываюць грамадскае распаўсюджванне і "свецкі" характар гучання.

Увасабленнем вернасці сваёй Радзіме з'яўлялася "выкананне ў адносінах да яе высокіх маральных імператываў" [3, с. 192]. З пункту гледжання хрысціянскай філасофіі гэта праяўлялася ў сімвалічным асобасным выратаванні па прыкладу Божаму, з пункту гледжання жыццёвай практыкі – у абароне Айчыны ад знешняй пагрозы. Выкананне грамадзянска-патрыятычнага абавязку, *"живота не жалея"*, стала сімвалам пераймання Хрысту, самаахвярная дзейнасць якога дзеля агульнага дабра "з'яўлялася ўвасабленнем галоўнага хрысціянскага пастулату – любові да бліжняга" [3, с. 195]. *"Нет больше той любви, если кто положит душу свою за други своя"* – гэта вядомае сцвярджэнне "было ўспрынята як патрыятычнае праваслаўнага славянства" [3, с. 195].

З другога боку, самаадданая абарона сваёй Радзімы ўспрымалася як святая справа веруючага чалавека, жыццё якога павінна быць накіравана на яе ўвасабленне. *"Лучше человеку добрая смерть, чем плохая жизнь"*, – сцвярджалі старажытныя крыніцы, акцэнтуючы ўвагу на ўседаравальным характары смерці чалавека перад агульнай небяспекай дзеля сваёй краіны [4, с. 242]. Пры гэтым, нашы продкі былі ўпэўнены , што клопат аб уласнай Айчыне выступае найлепшым паказчыкам годнага чалавека:*"лучше на Родине костьми лечь, чем на чужбине быть в почете"* [4, с. 262].

Такім чынам, рэлігійная дамінанта ў змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання XIV–XV стст. адыгрывала вядучую ролю ў фарміраванні шэрагу запатрабаваных якасцей патрыёта і грамадзяніна. Засваенне хрысціянскіх каштоўнасцей, ідэй дабрачыннасці і чалавекалюбства выступала важнай акалічнасцю адаптацыі асобы да ўмоў сацыякультурнай рэчаіснасці Сярэднявечча, яе прывучэння да светапоглядна-каштоўнасных канстант з мэтай асобаснага росту і грамадскай рэалізацыі годнага патрыёта і грамадзяніна

**Літаратура**


1. *Анисимов, С.Ф.* Настольная книга атеиста / С.Ф. Анисимов, Н.А. Аширов, М.С. Беленький [и др.] ; под общ. ред. С.Д. Сказкина. – 9-е изд., испр. и доп. – М. : Политиздат, 1987. – 431 с. : ил.
2. *Вишневский, М.И.* Философский синтез как мировоззренческая основа образования : монография. / М.И. Вишневский. – Могилев :Изд-во Могилевского гос. ун-та им. А.А. Кулешова, 1999. – 252 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. *Забияко, А.П.* История древнерусской культуры / А.П. Забияко. – М. : Интерпракс, 1995. – 304 с.
4. История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха Средневековья : хрестоматия : пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2009. – 396 с.
5. Наставление отца сыну // Памятники литературы Древней Руси. XIV – середина XV века / вступ. статья Д.С. Лихачева ; сост. и ред. Л.А. Дмитриева и Д.С. Лихачева. – М. : Худ. лит., 1981. – С. 496–500.
6. Пчела // Памятники литературы Древней Руси: XIII век / вступит. статья Д.С. Лихачева ; общ. ред. Л.А. Дмитриева и Д.С. Лихачева. – М. : Худож. лит., 1981. – С. 474–486.
Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова